Другі фронт мастацтваў

Пятро Васючэнка

# ПІРАМІДА ЛІННЕЯ

Бестыярый

Мінск
“Галіяфы”
2008

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
В91

Серыя заснавана ў 2000 годзе

Пісьменнік і навукоўца Пятро Васючэнка ў вершаванай форме раздумвае пра лёс усяго жывога на планеце Зямля. Сэнс ягоных разваг выліваецца ў крышталёва празрыстую, даступную для дарослых і дзяцей форму. Аўтар стварае ўласны бестыярый (а бестыярый – гэта старадаўні літаратурны жанр, у межах якога паўстаюць партрэты ўсялякіх жывёлаў), і робіць гэта дзеля таго, каб чалавек XXI стагоддзя паважаў быццё кожнага чарвячка, кожнай кузуркі, кожнай жывой істоты, створанай Госпадам, бо ад гэтай павагі залежыць і ягонае ўласнае жыццё, і лёс цывілізацыі. Кніга разлічана на самага шырокага чытача.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6906-08-7**

© Васючэнка П.В., 2008
© Афармленне. ПУВП "Галіяфы", 2008

# РАНІЦА: ДЗЕНЬ ЧАЦВЁРТЫ
## Слова аўтара

Змалку меў сантымент да братоў нашых меншых, да ўсяго, што варушыцца, корпаецца ў зямлі, поўзае, плавае, бегае, лётае ў паветры. У кожнай калюжыне бачыўся мне цэлы свет: адзін ножкамі перабірае, другі робіць раскопкі ў глеі, трэці слізгае па паверхні вады, бы заўзяты фігурыст. І, на жаль, нехта некага заўсёды жмакае; так ужо гэты свет уладкаваны.

Маім літаратурным кумірам таго часу быў Джэральд Дарэл,

вялікі сябра ўсяго жывога. Я разглядаў свет жывога праз акуляры, лупу і мікраскоп, вёў заалагічныя дзённікі, мерыўся паступаць на біяфак. І хаця гэты праект не спраўдзіўся, цікавасць да ўсяго жывога засталася ўва мне назаўсёды. Цягам часу, роздумаў, яна перарасла ў пытанне: дзеля чаго ўсё гэта створана?

“І быў вечар, і была раніца: дзень чацвёрты”, — нагадвае Біблія пра той пункт адліку, ад якога на Зямлі заварушылася ўсё жывое. Ад гэтага моманту мора напоўнілася рыбамі ды іншымі істотамі, птушкі паляцелі над зямлёй, сушу запоўнілі жамяра, паўзуны, звяры, і Бог казаў, што гэта добра, блаславіўляў кожную існую

душу на жыццё і множанне, а на пяты дзень ужо і чалавек быў створаны...

Я глыбока перакананы ў тым, што ўсё гэта было недарэмна, і што кожная кузурка, кожны чарвячок, кожная жывая істота, на якую часам зірнуць брыдка, — усе яны недарэмна займаюць сваё месца пад сонцам.

Не я першы пра гэта раздумваў, бо пісьменнікі былых часоў не раз прысвячалі свае творы братам нашым меншым. Найлепш гэта зрабіў, на маю думку, французскі паэт Гіём Апалінэр (беларус па паходжанні). Ён напісаў сусветна вядомы

“Бестыярый, або Картэж Арфея”.

Ствараючы свой бестыярый, я кіраваўся сістэмай Карла Ліннея, гэтага педантычнага шведскага акадэміка, які ў XVIII стагоддзі падзяліў усё жывое на віды, роды, класы, засведчыў іерархію жывёлаў і раслін і спавядаў крэацыянізм — веру ў створанасць свету Богам з нічога. Я, напэўна, не зусім дакладна перадаў сістэму Ліннея, але ў цэлым пільнаваўся ягонай стратэгіі ўзыходжання ад ніжэйшых формаў існавання да вышэйшых. А чалавека памясціў у гэтую сістэму дзеля таго, каб не дужа задаваўся.

Кнігу сваю адрасую самаму шырокаму чытачу са спадзяваннем

**на тое, што дарослыя прачытаюць дзецям (тым, што не ведаюць граматы) тыя вершыкі, якія не пададуцца ім занадта фрывольнымі.**

**У XXI стагоддзі ў сумоўі чалавека і братоў ягоных меншых павінен дзейнічаць маральны імператыў: “Не растапчы”. І калі ў некага спыніцца нага, перш чым раздушыць свайго меншага брата ці сястру, буду лічыць, што мой бестыярый створаны недарэмна.**

*Пятро Васючэнка*

# МІКРОБЫ

Навошта створаны мікробы?
Каб раздаваць усім хваробы:
Сухоты, воспу і адзёр,
Каб чалавек хутчэй памёр.



## МЕДУЗА

Дзеля чаго жыве медуза?
Цягаць па моры сваё пуза.
Яна — марская крапіва,
У яе пустая галава.
Паўна-паўнюткая вады,
Плыве туды, плыве сюды.



## СКАРПІЁН

«Нашто я? — думаў скарпіён. —
Сяджу у дзюрцы, як шпіён,
Але ўжо як цябе ўкушу,
Дык Богу аддасі душу!»



## ВОШЫ

Дзеля чаго існуюць вошы?
Калі прысняцца — будуць грошы.
А хто наяве мае вошай,
Звычайна той не мае грошай.



## БЛОХІ

Ну, а навошта скачуць блохі?
Яны кусаюць усіх патрохі:
І караля, і жабрака,
І сваяка, і чужака.



## ЖУК

Дзеля чаго існуе жук?
Маленькі сам, вялікі гук.
Ты не бяры яго у ручку,
Бо дом ягоны — гною кучка.



## МУХА

Дзеля чаго існуе муха?
Яна пяюха, хіхатуха.
Яна лятае над лугамі,
А ходзіць дагары нагамі.
Адно вось толькі мае гора,
Калі наесца мухамораў.



## ЖАБКІ

Нашто жывуць у свеце жабкі,
Чые ў Парыжы любяць лапкі?
Каб не драмаў чарвяк і вусень
І каб быў сыты дзядзька бусел.



## ВУЖАКІ

Навошта створаны вужакі?
Яны праныры і пужакі,
Яны ядуць мышэй і жаб,
І я не раю іх пужаць.



## КОБРА

Навошта створаная кобра?
Яна плюецца вельмі добра,
Калі пацэліць каму ў вока,
Душа яго ўзляціць высока.



## ЧАРАПАХА

Нашто стварылі чарапаху?
Напэўна, з ёю далі маху.
Не павязе яна на дачу —
Няма каробкі перадачаў.



# КРАКАДЗІЛ

Нашто стварылі кракадзіла?
Глытаць разяваў і дэбілаў.
Ён не глыне цябе і нашча,
Абы ты сам не лез у пашчу.



# ЦМОК

Дзеля чаго існуе цмок,
Які ў балоце мок ды мок?
Для рыцара існуе цмок,
Каб той прыйшоў і перамог.



# ІНДЫК

Дзеля чаго жыве індык?
Каб мармытаць: «Дык-дык, дык-дык!»
Яму я раю: «Памаўчы!
Збяры з-пад дзюбы смаркачы!»



# САВА

Навошта створана сава,
Чыя з вушамі галава?
Яна галосіць па начах,
Хаўтуры ладзіць па мышах.



# ВАРОНА

— Дзеля чаго жыве варона? —
Я запытаўся ў Кальдэрона.
— Жыццё ёсць сон, — прамовіў ён, —
Варона ёсць таксама сон.



## ЗАЙЦЫ

Нашто жывуць у свеце зайцы?
Каб іх не крыўдзілі мярзаўцы,
Каб не цягалі іх за вушы,
Каб грызці яблынькі ды грушы.



# ВОЖЫК

Дзеля чаго існуе вожык?
Ты не бяры яго у ложак,
Ён не дае нікому спаць,
Бо не галіўся гадоў пяць.



## МЫШ

Нашто жыве на свеце мыш?
Каб лезці ў клець, пакуль ты спіш.
Тачыць сыры, кілбасы, крупы
І пакідаць у пастцы трупы.



## ВАВЁРКА

Навошта створана вавёрка?
Каб грацыёзнай быць і вёрткай,
Каб мець утульнае жытло —
Арэхаў поўнае дупло.



# ЛІСА

Дзеля чаго жыве ліса?
Каб ціха шнырыць па лясах.
Яна за ўсіх звяроў мудрэй:
Цягае гусак і курэй.



## ВАЎКІ

Навошта створаны ваўкі?
У іх не зубы, а штыкі,
На тое створаны ваўкі,
Каб рэзаць свінні і быкі.



# ЛЕЎ

Дзеля чаго існуе леў?
Яго ты не загоніш у хлеў.
Зжэр антылопу – і зароў,
На тое ён і цар звяроў.



# РЫСЬ

Дзеля чаго існуе рысь?
Калі на рысь ты крыкнеш “Брысь!”,
Яна не кінецца ў кусты,
А пабяжыш хавацца ты.



## КОТКА

Дзеля чаго існуе котка,
Пралаза, шэльма і какотка?
Знішчаць мышыную пароду,
Чыніць паўсюль малую шкоду.



## ВЯРБЛЮДЫ

Дзеля чаго жывуць вярблюды?
Яны — гарбатыя няўклюды,
Грызуць калючыя кусты,
І не баляць ім жываты.



# СВІННІ

Нашто жывуць у свеце свінні?
Каб чмякаць бульбу і бацвінне,
Каб падрасталі кумпячкі,
Каб віскаталі парсючкі.



# КАРОВЫ

Навошта створаны каровы?
Каб мы усе былі здаровы,
З’ясі смятанку ці кефір,
І будзеш лёгкі, як зефір.



# КОНІ

Навошта створаныя коні?
Ляцець за ворагам у пагоню.
І не дражні каняку ты,
Бо мае зубы й капыты.
Пяю асанну я каню
За мужнасць і за чысціню.



## СЛАНЫ

Навошта створаны сланы?
Яны — як чорныя млыны.
Яны вялізны маюць рост,
А замест носа носяць хвост.



# КІТЫ

Дзеля чаго жывуць кіты?
Яны не ск*а*ты, не скат*ы*,
Калі пускае кіт фантан,
Шкадую я, што не шампан.



# СТУДЭНТЫ

Навошта створаны студэнты?
Каб іх тыранілі дацэнты,
Каб іх скубалі дактары,
Каб засыхалі без пары.



## ПАЭТЫ

Дзеля чаго жывуць паэты?
Жывуць... І дзякуй ім за гэта.



# Я

Дзеля чаго існую я?
Па гараскопе я — Свіння,
І Вадаліў, і Кіпарыс.
Такі мой зорны відарыс.
І калі я жыву пад небам,
Дык, значыць, некаму патрэбен.
Жывуць усе, жыву і я,
Са мною — ўся мая сям'я.



## ЧАЛАВЕК

Жывеш навошта, чалавек?
Твой на зямлі кароткі век.
Пажыў, сапсеў — і памірай,
І трапіш у пекла або ў рай.



# Змест

РАНІЦА: ДЗЕНЬ ЧАЦВЁРТЫ
Слова аўтара **3**

МІКРОБЫ **8**
МЕДУЗА **9**
СКАРПІЁН **10**
ВОШЫ **12**
БЛОХІ **14**
ЖУК **16**
МУХА **18**
ЖАБКІ **20**
ВУЖАКІ **22**
КОБРА **24**
ЧАРАПАХА **26**
КРАКАДЗІЛ **28**
ЦМОК **30**
ІНДЫК **32**
САВА **34**

ВАРОНА **36**
ЗАЙЦЫ **38**
ВОЖЫК **40**
МЫШ **42**
ВАВЁРКА **44**
ЛІСА **46**
ВАЎКІ **48**
ЛЕЎ **50**
РЫСЬ **52**
КОТКА **54**
ВЯРБЛЮДЫ **56**
СВІННІ **58**
КАРОВЫ **60**
КОНІ **62**
СЛАНЫ **64**
КІТЫ **66**
СТУДЭНТЫ **68**
ПАЭТЫ **69**
Я **70**
ЧАЛАВЕК **72**

Літаратурна-мастацкае выданне
Другі фронт мастацтваў

**ВАСЮЧЭНКА** ПЁТР ВАСІЛЬЕВІЧ
Піраміда Ліннея
Бестыярый

Адказны за выпуск Уладзімір Гніламёдаў; Рэдактар Леанід Дранько-Майсюк; Дызайн вокладкі Сяргей Ждановіч;
Вёрстка Міхась Башура; Карэктар Юлія Аляксандрава

Падпісана да друку 18.08.2008. Фармат
Папера афсетная. Гарнітура “Trebuchet”. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. Ул.-выд. арк. Наклад 200 асоб. Замова

Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства “Галіяфы”
ЛВ № 02330/0150300 ад 08.04.2008 г.
220039, г. Мінск, вул. Брылеўская, 11—44.
E-mail: vish@bk.ru www.goliafy.com

Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю “Медисонт”.
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.2004 г.
220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9